# Некалькі пакаленняў віцебскай школы — у адным выставачным праекце

07.04.2024

**У сталічнай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося ўрачыстае адкрыццё выставачнага праекта «Віцебскі мастак», у якім сабраны работы аўтараў некалькіх пакаленняў віцебскай школы. Розныя жанры, арыгінальныя сюжэты, багацце тэм — арганізатары імкнуліся паказаць здольнасці living рознабаковых мастакоў. Дэманстуюцца ў асноўным рэалістычны і абстрактны жывапіс, графіка і скульптура. Сярод удзельнікаў — як вядомыя творцы, так і аўтары, імёны якіх не вельмі часта гучаць у мастацкім асяродку.**



Аляксандр Карпан «Маладое віно», 2014 г.

Удзел у адкрыцці выстаўкі «Віцебскі мастак» прынялі дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Марына Татарэвіч, дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Таццяна Старынская, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў мастацтвазнаўца Наталля Шаранговіч, загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства Рыгор Шаура, а таксама адзін з удзельнікаў выстаўкі Уладзімір Пракапцоў.

— Для нас знакава, што праект, які паспеў ужо стаць папулярным не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі, экспануецца ў нашых выставачных залах, — расказала падчас адкрыцця выстаўкі дырэктар галерэі «Універсітэт культуры» Марына Татарэвіч. — Гэта шанс прадэманстраваць дасягненні шматгадовай працы выдатных мастакоў Віцебшчыны, а яшчэ — магчымасць пацвердзіць іх вопыт, узровень і, напэўна, пазначыць перспектыву развіцця віцебскай мастацкай школы.

Марына Татарэвіч падзякавала кіраўніцтву і супрацоўнікам краязнаўчага музея, якія прадставілі экспанаты. Яна выказала спадзяванне, што супрацоўніцтва паміж віцебскім музеем і мінскай галерэяй будзе развівацца і ўмацоўвацца дзякуючы новым творчым ідэям.



Алег Скавародка «Маладажоны», 2000 г.

Тым часам першы намеснік старшыні БСМ Наталля Шаранговіч падкрэсліла, што Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза мастакоў з’яўляецца самай вялікай па складзе ў рэспубліцы пасля мінскай:

— Віцебскія мастакі не спяшаюцца ў сталіцу — ім добра ў сваім горадзе. Бо цудоўны сам Віцебск з яго выдатнымі ландшафтамі і архітэктурнымі помнікамі, бо ёсць дзе атрымаць адукацыю, бо існуе гісторыя і яе можна па-рознаму раскрываць. Да таго ж ёсць аднадумцы, ёсць выставачныя пляцоўкі. Я рада, што музей ажыццявіў ідэю паказу творчасці віцебскіх мастакоў, задуму сабраць іх, зрабіць адзіную экспазіцыю, дэманструючы яе на працягу не аднаго года.

Праект «Віцебскі мастак» аб’яднаў работы Фелікса Гумена, Ігара Шкуратава, Святланы Врублеўскай, Галіны Васільевай, Вячаслава Шамшура, Аляксандра Мемуса, Уладзіміра Напрэенкі, Мікалая Дундзіна, Вячаслава Шайнурава, Наталлі Лавіцкай-Ярмолавай, Алега Кастагрыза, Валянціны Ляховіч, Аляксандра Слепава, Андрэя Вайцяхоўскага... Большасць удзельнікаў — члены Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза дызайнераў, выпускнікі і выкладчыкі мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава і кафедры дызайну Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Між тым увайшлі ў экспазіцыю работы Аляксандра Карпана, якога не стала ў 2016 годзе.

Дарэчы, кар’ера многіх мастакоў звязана са сталіцай. Так, Уладзіміра Пракапцова большасць ведае як шматгадовага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея, мастацтвазнаўцу і педагога, які шмат зрабіў для беларускай культуры. На выстаўцы «Віцебскі мастак» Уладзімір Іванавіч прадставіў некалькі яркіх лаканічных пейзажаў («Нараджэнне дня. Полацк», 2017; «Таемнасць», 2019; «Дом ветэрана. Развітанне», 2024) і чуллівы партрэт «Пяшчота. Вера» 2023 года — жонка мастака Вера Пракапцова, мастацтвазнаўца і педагог, пайшла з жыцця ў 2021 годзе.



Аляксандр Мемус «Віцебск. Ратушны дворык», 1979 г.

Яшчэ адзін вядомы ў Беларусі і за яе межамі творца Уладзімір Шапо, родам з Браслаўшчыны, жыве і працуе ў Мінску. Мастак шмат падарожнічаў, што адлюстравана ў яго творчасці, аднак асноўная тэма — родныя мясціны. У экспазіцыі можна ўбачыць яго арыгінальныя стракатыя карціны «Вёска Крупеніна. Дах Сцяпана», «Крупеніна. Грушавае віно» і «Крупеніна. Каваль» (усе 2021 года).

Выстаўка «Віцебскі мастак» будзе працаваць да 20 красавіка.